ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 171 (1130) | НЯДЗЕЛЯ, 27-га ліпеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

1-га жніўня—дзень баявой праверкі

Капіталістычны сьвет хрупіцца ў муках развалу. Сусьветны эканамічны крызіс абвастрае супярэчнасьці як унутры капіталістычных краін, так і паміж капіталістычнымі краінамі. У той-жа час сусьветны эканамічны крызіс абвастрае супярэчнасьці паміж СССР і капіталістычным сьветам. Кожны дзень пасьпяховага выкананьня нашай пяцігодкі пашырае процілегласьць як паміж працай і капіталам у буржуазных, колёніяльных і поўколёніяльных краінах, так паміж краінай будуючагася социялізму і капіталізмам у астатніх пяці шостых частках сьвету.

На падставе гэтых супярэчнасьцей, як чотка зазначыў тав. Сталін у сваім дакладзе XVI зьезду нашай партыі, пагроза імпэрыялістычнага нападу на нас становіцца ўсе больш адчувальнай і рэальнай.

Усе растучыя супярэчнасьці капіталістычнага ладу, якія пераходзяць ужо зараз у жорсткую барацьбу за рынкі збыту, падточваюць самыя асновы капіталістычнага ладу. Адсюль—думка капіталістых—імкнуцца вырашыць усе гэтыя супярэчнасьці за кошт СССР.

Мэты рыхтуючайся супроць нас імпэрыялістычнай вайны двалякія—1. разбурыць манаполію замежнага гандлю, сарваць індустрыялізацыю і ператварыць нашую краіну ў колёніяльны прыдатак да імпэрыялістычных краін. Гэта дало-б імпэрыялістым выхад на некаторы час, з крызісу, выклікаванага перавытворчасьцю тавараў і 2. зьнішчыць дыктатуру пролетарыяту ў СССР, — базу сусьветнай рэволюцыі. Існаваньне-ж дыктатуры пролетарыяту на 1/6 частцы сьвету рэволюцыянізіруе барацьбу рабочых і сялян у капіталістычных краінах. Зрыў гэтай дыктатуры азначаў-бы ўзмацненьне панаваньня чарнейшай рэакцыі ва ўсім сьвеце, зьнішчэньне шмат тых нязначных дасягненьняў, якія пролетарыяту ў капіталістычных краінах удалося вырваць у сваіх эксплёататараў у пасьляваенны пэрыод.

У гэтых абставінах ідзе падрыхтоўка секцыі Комінтэрна да міжнароднага дню барацьбы з пагрозай імпэрыялістычнай вайны—1-га жніўня.

Асноўная задача ўсёй падрыхтоўкі і самога антываеннага дню заключаецца менавіта ў мабілізацыі працоўных мас вакол гэтых штодзенных пытаньняў. Надзвычайна вырастае ў гэтых адносінах значэньне масавай работы КІМ'у і яго секцый. Маладыя-ж рабочыя і сяляне—той матар'ял, які прадназначан імпэрыялістымі выконваць ролю гарматнага мяса ў вайне супроць нас. Іменна моладзь павінна будзе захапіць на заводах і фабрыках, вырабляючых ваенныя ўзброеньні рабочых, якія прызываюцца на вайну.

Дзейная барацьба супроць пагрозы імпэрыялістычнай вайны немагчыма без рашучай барацьбы супроць самога капіталістычнага ладу. Барацьба за абарону СССР—гэта адначасова барацьба супроць зьніжэньня зарплаты, павялічэньня рабочага дню капіталістычнай рацыяналізацыі, за магчымыя ўмовы працы і існаваньня працоўных мас у капіталістычных краінах.

Абставіны для пасьпяховага праводзеньня 1 жніўня як дню мобілізацыі на барацьбу з капіталістычным ладам у гэтым годзе выключна спрыяючыя.

Ва ўсіх капіталістычных краінах буржуазія наступае разгорнутым фронтам на рабочыя масы. У Нямеччыне фашызацыя ідзе страшэннымі тэмпамі. Усюды зьніжана зарплата. Пагоршаны ўмовы соц. страхаваньня ўсіх відаў. У парадку § 48 конституцыі (прадстаўляючаму прэзыдэнту рэспублікі права выдаваць любы закон апрача рэйхстагу) уводзяцца новыя цяжкія падаткі. У той-жа час стала даражэй жыцьцё дзякуючы павышэньню падаткаў і акцызаў на прадметы першай неабходнасьці.

У Ангельшчыне лэйборыцкі урад капітуліраваў перад лёрдамі ў пытаньні аб скарачэньні рабочага дню горнарабочых. Рукамі ураду Макдональда праводзіцца як у бавоўняна-папяровай, так і ва ўсіх іншых галінах прамысловасьці, капіталістычная рацыяналізацыя, якая зьнясільвае рабочыя масы і павялічвае шэрагі 2-х мільённай арміі беспрацоўных.

Наступленьне на рабочую клясу ідзе і ў Францыі, Італіі і ў астатніх прамысловых краінах Эўропы.

У аграрных краінах узмацняецца фашызацыя. Па кроках Італіі, Вэнгрыі, Польшчы і Югаславіі ідуць Румынія і Фінляндыя.

Міжнародная соцыял-дэмократыя ўсімі сродкамі садзейнічае падрыхтоўцы імпэрыялістычнай вайны, усыпляючы пільнасьць рабочых мас, распаўсюджваючы хлусьню аб „ваеннай небясьпецы, якая рыхтуецца з боку чырвонага імпэрыялізму“.

Пагэтаму 1-ае жніўня павінна стаць рашучым баявым днём, які выкрые здрадніцтва міжнароднай соцыял-фашысцкай клікі.

Для секцый КІМ'у 1-ае жніўня будзе праверкай і баяздольнасьці, уменьня мобілізаваць масы рабочай моладзі вакол жывых блізкіх і зразумелых працоўным лёзунгаў барацьбы супроць капіталістычнай сыстэмы і за абарону СССР.

Новае разьвіцьцё нашай прамысловасьці

...зьезд нашай партыі, які засядаў ...гістарычны год, калі наша социялістычная прамысловасьць пераходзіла ...аднаўленчага пэрыоду да шырокай і глыбокай рэконструкцыі, даў ...ую і цьвёрдую дырэктыву: „у адносінах з політыкай індустрыялізацыі краіны ў першую чаргу павінна быць узмоцнена вытворчасьць ...каў вытворчасьці“.

...працягу двух з паловай год усе ...рабочае клясы Савецкага Саюзу ...накіраваны на выкананьне гэтай ...альнай лініі партыі, на форсіраванае разьвіцьцё ўласнай сваёй цяжкай прамысловасьці, якая зьяўляецца падставай нашай эканамічнай незалежнасьці. ...і воля пролетарыяту краіны, будуе соцыялізм на адной шостай частцы зямной кулі, далі бліскучы вынік. Да 16 зьезду партыі мы ...алі не толькі з велізарным абсалютным ростам цяжкай прамысловасьці ...і рэзка ўзрослай удзельнай ...вагой ва ўсёй нашай народнай гаспадарцы.

...Рэволюцыйныя тэмпы разьвіцьця цяжкай прамысловасьці пакінулі далёка ззаду першапачатковыя наметкі пяцігадовому пляну і ўжо ў будучым годзе мы будзем мець у цэлым ...выкананьне пяцігодкі па ўсёй цяжкай індустрыі.

...ае становішча склалася ў лёгкай індустрыі. Тут у некаторых галінах мы перавыканалі пяцігодку, у некаторых—разьвіццё ішло па пляну, а дзе-ні-дзе нават ...ла. Ператварэньне СССР з краіны аграрнай у індустрыяльную ўласна ...выклікала неабходнасьць дабіцца рашучага пералому ў форсіраваньні разьвіцьця цяжкай прамысловасьці перш за ўсё ў гэтую галіну накіроўваліся сродкі лёгкай прамысловасьці. Уся ўвага была зьвернута сюды, на гэты асноўны ўчастак нашай індустрыялізацыі ...гэтага часу мы эканомілі на ўсім, у тым ліку і на лёгкай індустрыі для таго каб аднавіць цяжкую“ (Сталін).

Цяжкая прамысловасьць аднаўлена, велізарныя посьпехі ў гэтай справе даюць нам магчымасьць павярнуцца тварам да лёгкай прамысловасьці, дабіцца і тут бліскучых посьпехаў.

XVI зьезд адкрыў новую балонку ў разьвіцьці нашай прамысловасьці. Гэтае новае тое. Сталін ахарактарызаваў так: „новае ў разьвіцьці нашай прамысловасьці састаіць, паміж іншым, у тым, што мы маем магчымасьць разьвіваць паскоранымі тэмпамі і цяжкую і лёгкую прамысловасьць“.

Правыя ў сваіх наскоках на генэральную лінію партыі імкнуліся даказаць, што ўзятыя тэмпы разьвіцьця цяжкай прамысловасьці не могуць быць вытрыманы, калі мы не разгорнем лёгкую прамысловасьць, вытворчасьць прадметаў шырокага спажываньня. Партыя гаварыла: толькі форсаванае разьвіцьцё вядучай галіны прамысловасьці — цяжкай індустрыі, толькі стварэньне асновы нашай эканомічнай незалежнасьці, толькі арганізацыя індустрыяльнай базы для росту лёгкай прамысловасьці дадуць нам магчымасьць паставіць на здаровыя рэйкі форсіраванае разьвіцьцё гэтага ўчастку нашай народнай гаспадаркі.

Жыцьцё перавярнула „тэорыю“ правых, бліскуча даказаўшы правільнасьць політыкі партыі.

Вялізарныя рэзэрвы, якія атрымала краіна ў выніку посьпехаў у машынабудаўніцтве, у стварэньні прылад сродкаў вытворчасьці даюць магчымасьць выкарыстаць гэтыя рэзэрвы і па ўкуць наперад лёгкую індустрыю, няўхільна працягваючы разьвіваць цяжкую.

Але было-б вялізарнай політычнай і гістарычнай памылкай лічыць, што адставаньне лёгкай прамысловасьці было выклікана станам не асноўнага капіталу. Рашаючай прычынай гэтага адставаньня зьявілася цяжкасьці, якія зьвязаны з недастатковым разьвіцьцём сыр'явой базы. Ужо зараз мы маем цяжкарыстаныя вытворчыя рэзэрвы.

Тав. Оржонікідзе на 16 зьезьдзе паведамляў, што, напрыклад, баваўняная прамысловасьць можа пры сучасным асноўным капітале перапрацоўваць падвоеную колькасьць сыравіны. Такім чынам, забясьпечаньне сыравінай—ключ да далейшага росту лёгкай прамысловасьці.

Стварэньне сыр'явой базы для прамысловасьці можа і павінна ісьці двума шляхамі: падвышэньне ўраджайнасьці тэхнічных культур, разьвіцьцё новых відаў сыравіны для лёгкай прамысловасьці.

Мы засяваем зараз пад бавоўну, лён, каноплю іншыя велізарныя, не шмат перавышаючыя даваенныя памеры, плошчы. Аднак тавары збор гэтых відаў сыравіны зусім нездавальняючы,—часам значна ніжэй даваеннага. Тут патрэбна ў найкарацейшы тэрмін дабіцца рашучага пералому, бо нізкая ўраджайнасьць ляжыць у разнастайнасьці і раздробленасьці гаспадарак, якія дабываюць гэтыя культуры. Сыр'явая проблема павінна быць вырашана такжа, як краіна вырашыла зерневую: арганізаваць у сыр'явых раёнах колгасы і саўгасы, стымулюючы ў той-жа час разьвіцьцё бядняцкіх і серадняцкіх індывідуальных гаспадарак.

Побач з гэтым патрэбна ўсялякае форсіраваць разьвіцьцё новых відаў сыравіны: кенафу, кендыру рамі і інш. Першыя крокі ў асобных раёнах Саюзу (Казакстан, Каўказ), па Ірадыцыі да ўзмацненьня засеву гэтых культур, далі добрыя вынікі. Вопыт гэты патрэбна выкарыстаць і пашырыць.

Партыя, уся рабочая кляса знойдзе ў сабе сілы, каб цалкам выканаць рашэньне зьезду.

Зьезд даручае ЦК у далейшай рабоце па соцыялістычнай індустрыялізацыі СССР з уставаць ілы партыі на ажыцьцяўленьне наступных асноўных задач: „узмоцненае разьвіцьцё галін прамысловасьці, які вырабляе прадукты масавага спажываньня (лёгкая індустрыя) з такім разьвіцьцём сыр'явой базы“. (З рэз. 16 партзьезду па справаздачы ЦК).

Я. Баранаў.

Тэлеграма-маланка

Усім атрадам „Лёгкай кавалерыі“ і юнкорам „Чырвонай Зьмены“

Згодна пастановы сілоснага штабу пры ЦК УсеЛКСМ і НКЗ СССР з 25-га ліпеня абвешчан „усесаюзны сілосны тыдзень“, які працягнецца да 5-га жніўня.

Рэдакцыя зварочваецца да вас як найхутчэй даслаць інформацыі па наступным пытаньням. Колькі намечана пабудаваць сілосных ям, траншэй і башняў у вашай акрузе, раёне, сельсавеце колгасе.

Ці даведзены пляны сіласаваньня і літаратура па сілоснаму будаўніцтву да саўгасаў, колгасаў і асобных пасёлішч? Колькі выкапана і пабудавана наогул і сіламі комсамольцаў сілосных ям і траншэй і наколькі тон, якія маюцца перашкоды ў праведзеньні гэтага важнейшага мерапрыемства?

Рэдакцыя газэты „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“.

Напярэдадні 1-га жніўня

Тысячы рабочых выкінуты на вуліцу

Тысячы рабочых гіне ад капіталістычнай рацыяналізацыі

БЭРЛІН, 24. За апошнія часы катастрофы на нямецкіх каменавугольных шахтах сталі частым зьявішчам. У мінулым годзе адбылася катастрофа на шахце ў Вальдэнбурзе, якая каштавала жыцьця 33 гарнякам. Толькі ў адной Прускай вугальнай прамысловасьці за год адбыліся 23 катастрофы і пяцічасных выпадкаў з шматлікімі ахвярамі.

За апошнія годы ў нямецкай вугальнай прамысловасьці загінула 2. 320 гарнякоў. На кожны дзень падае 4 няшчасных выпадкі з сьмяротным канцом. Вось вынікі драпежніцкай капіталістычнай рацыяналізацыі праводзімай вугальнымі баронамі.

У выніку сусьветнага эканомічнага крызісу і капіталістычнай рацыяналізацыі з усёй моцаю абрушваюцца масавыя звальненьні і скарачэньне рабочага тыдню. У адным 1930 годзе звольнена ў Рурскай вобласьці 37.000, у Верхняй Сілезіі—каля 12.000, у Ніжняй Сілезіі—каля 2.000 і ў Саксоніі—каля 3.000 нямецкіх горнарабочых.

ПРАГА, 24. У Чэха-Славакіі працягвае расьці беспрацоўе. Прадставіць звальненьне 1300 рабочых занятых на прадпрыемствах Пражскага муніцыпалітэту. Асабліва пагражаючыя разьмеры прымае беспрацоўе ў Славакіі, дзе застанаўлівае і скарачае работу шэраг лесапільных заводаў. Акрамя таго звальняюцца рабочыя і служачыя чыгункі, рабочыя прыстані і інш. Органы міністэрства працы рэкамендуюць кваліфікаваным рабочым паступаць у якасьці чорнарабочых на дарожныя работы.

ВЕНА, 24. З Румыніі паведамляюць аб прадстаячым зьніжэньні заработнай платы на 20 проц. на капальных у даліне Прахава. На заводзе ў Рэжыцы ўноў узьнікла пагроза забастоўкі, так, як дырэкцыя заводу не толькі не выканала сваіх абавязацельстваў, на падставе якіх была спынена забастоўка, але зноў зьнізіла заработную плату. У Вокупы звольнена каля 600 тэкстыльшчыкаў, у Галацэ працягваецца забастоўка докераў, у Враіле пашыраецца конфлікт партовых рабочых.

Маніфэстацыі ў бэрлінскім парку Люстгартэн у дзень 1-га жніўня забаронены ўсім, акрамя с-дэмократаў.

ЛЮСТГАРТЭ...

— Праходзьце сьмялей,—вы не старонькі.

Н бясьпечны ў ... ост

У часе дэмонстрацый у Бэрліне ўперадзе калёны маленькі акцябронак нёс плякат з карыкатурай паліцэйскага... Раптам група паліцэйскіх накінулася на дзяцей і схапілася за гумовыя дубінкі.

Бурныя дэмонстрацыі піонэраў і рабочых у Бэрліне

БЭРЛІН, 23. З прычыны міжнароднага зьлёту юных піонэраў у Бэрліне адбыліся 12 прывітальных мітынгаў, на якіх прысутнічала шмат тысяч піонэраў і рабочых, пры ўдзеле атрадаў забароненай анты-фашысцкай маладой гвардыі, Чырвонага юнг-фронту і саюзу Чырвоных Франтавікоў. На мітынгах раздаваліся рэзкія протэсты супроць забароненьня ўезду ў Нямеччыну савецкай піонэрскай організацыі. Выступаўшыя піонэры ў тым ліку і дзеці ад 8 да 12 год, пад шумныя апляадысмэнты сабраўшыхся клаліся разам з рабочай моладзьдзю змагацца за дыктатуру пролетарыяту.

Продаж дзяўчат у Індыі

ЛЁНДАН. Згодна паведамленьня Рэйтэра, міністр па справах Індыі заявіў у палаце вобшчын, што продаж дзяўчат да гэтага часу існуе ў Качэ, Катыавары, Гуджэрапе і Марвары. Дзяўчыны прадаюцца пасярэднікамі на комісыйных пачатках быццам-бы для шлюбу, а ў сапраўднасьці-ж гэта—захаваная форма нявольніцтва.

Дырэктыва партыі ня выканана

Падача заяў рабочымі з вытворчасьці і батракамі ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы БССР—нездавальняю
Укамплентаваньню пэдфаку і пэдтэхнікумаў пагражае зрыў

МОБІЛІЗАЦЫЯ „КОМСАМОЛЬСКАЙ ТЫСЯЧЫ“ НЕ ДАВЕДЗЕНА ДА ПРОЛЕТАРСКІХ МАС

Падрыхтоўку да навучальнага году пад кантроль мас

Будаўнічыя організацыі ў шэрагу акруг зрываюць падрыхтоўку памяшканьняў

Задачу падрыхтоўкі кадраў магчыма выканаць толькі пры ўмове актыўнага ўдзелу шырокай працоўнай грамадзкасьці.

Але на сёньняшні дзень мы яшчэ ня бачым дастатковай увагі і практычнай дапамогі з боку шырокіх колаў грамадзкасьці і комсамольскай організацыі.

Маецца цэлы шэраг фактаў, калі гаспадарчыя, профсаюзныя і комсамольскія організацыі глядзяць на навучальныя ўстановы, іх абсталяваньне і складаньне для іх работы належных умоў, як на нешта маючае другараднае значэньне. З боку некаторых акруговых і раённых органаў Наркомасьветы наглядаюцца таксама безадказныя адносіны, аб чым сьведчыць ход падрыхтоўкі да новага навучальнага году па шэрагу акруг.

Па Магілеўскай акрузе нават яшчэ не зацьверджана АВК і не праведзена праз Акрплян сетка навучальных і політ-асьветных установаў і будаўніцтва іх, інспэктары бачачы такую запушчанасьць працы ўходзяць у адпачынак. Так з 7 інспэктароў працуе—1. У той час як праца па абсталяваньню інтэрнатаў па акрузе не праведзена: мэдтэхнікуму не хапае на 200 чалавек, Пэдінстытуту на 500 чалавек і г. д.

Па Віцебскай акрузе інтэрнатамі патрэбна забясьпечыць 1500 чалавек, а забясьпечваецца толькі 730. Шмат школ і політасьветных установаў будуць забясьпечаны плошчай толькі на 20-30 проц. Зрываецца пабудова Віцебскага рабфаку.

У Менску ня гледзячы, што будуюцца баракі для студэнтаў на 1250 чалавек, вышэйшыя навучальныя ўстановы і тэхнікумы будуць не забясьпечаны інтэрнатамі на 2000 чалавек. У Менску-ж павінна было[?]ня гледзячы на тое, што большасьць будаўнічых матар'ялаў зьвезена і ляжаць па сёньняшні дзень, будаўнічыя органы ня прыступілі да будаўніцтва дашкольнага тэхнікуму.

У Рагачоўскім тэхнікуму не хапае навучальнай плошчы на 150 чалавек, а інтэрнатаў на 185. Дрэнна абстаіць справа і з памяшканьнем у Рэчыцкім тэхнікуме.

Па Полацкай акрузе не хапае інтэрнату для 240 студэнтаў.

Праўленьне БДУ і Фізкультэхнікум ніяк ня могуць дагаварыцца на працягу доўгага часу, каб БДУ аслабаніла памяшканьне тэхнікуму (па Савецкай вуліцы), якое занята толькі рэчамі БДУ ў той час, як БДУ ўжо больш-менш памяшканьнем забясьпечана, а тэхнікум можа застацца без памяшканьня і сарваць навучальны год. Усё гэта можа быць, але яны могуць затрымаць своечасовы пачатак навучальнага году. Нашыя гаспадарчыя органы, да якіх гэта непасрэдна датычыцца, будаўніцтва, рамонт і г. д. ня прымаюць ніякіх захадаў, каб зьнішчыць такое становішча.

Нарэшце трэба адзначыць, што справа з організацыяй харчаваньня студэнтаў па лініі ЦРК знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы. ЦРК амаль нічога не зрабіў у сэнсе вывучэньня гэтага пытаньня і прыняцьця крокаў да організацыі харчаваньня студэнтаў.

Ды і ў іншых акругах таксама з харчаваньнем абстаіць справа дрэнна. Напрыклад, у Бабруйску няма ніводнай студэнцкай сталоўкі. Мы павінны паставіць пытаньне перад цэрабкопамі ў усёй рашучасьцю, каб апошнія зьвярнулі належную ўвагу і прынялі конкрэтныя крокі да забясьпечаньня студэнтаў харчаваньнем.

Цяпер, пяройдзем да пытаньня, як абстаіць справа з правядзеньнем падрыхтоўчай працы да ўкомплектаваньня навучальных установаў. Можна адзначыць, што праца вядзецца з рук вон дрэнна. Напрыклад, на 10 ліпеня ў Полацкі пэдтэхнікум было пададзена 2 заявы, у Лепельскі—7, у Рэчыцкі 27, ня лепш і у іншых тэхнікумах. У гэтым маецца вялікая віна і комсамольскай організацыі, якой трэба было-б паставіць пытаньне вярбоўкі ў навучальныя ўстановы на прадпрыемствах, колгасах, вёсках і асабліва вярбоўкі ў пэдагагічныя тэхнікумы. Комсамольскія організацыі ў гэтай працы яшчэ не праявілі патрэбнай увагі і ініцыятывы.

Па лініі правядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці надта мала чаго зроблена.

Патрэбна зараз-жа організаваць шэраг курсаў па падрыхтоўцы, ліквідатараў няпісьменнасьці, а ў гэтым напрамку за выключэньнем Гомельскай акругі нідзе нічога ня робіцца.

Яскравым прыкладам як ня трэба рыхтавацца да навучальнага году зьяўляецца Лепельскі раён Полацкай акругі, дзе яшчэ ніякай працы па комплектаваньню, разьмеркаваньню комплектаў і інш. не праведзена.

Гэтыя факты зьяўляюцца трывожнымі сыгналамі, па ліквідацыю гэтых прарываў мы павінны мобілізаваць усю грамадзкасьць і ў першую чаргу комсамол. Мы павінны перайсьці да агульнага разважаньня да практычнай працы па праверцы як рыхтуюцца на мясцох асобныя організацыі да надыходзячага навучальнага году.

Захарык.

Першы навуковы год у інстытутах пад пагрозай зрыву

Краіна патрабуе кадраў, асабліва кадраў тэхнічных па індустрыялізацыі краіны, па рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Партыя дала дырэктыву—форсаваць тэмпы падрыхтоўкі тэхнічна-адукаванай моладзі. Урад выконваючы дырэктывы партыі пастанавіў адчыніць у Менску ВТНУ. Гэтымі днямі Саўнарком вынес пастанову замест ВТНУ адчыніць інстытуты: хэміка-тэхнолёгічны, будаўнічы, электра-тэхнічны у Менску і мэханічны у Гомелі. Але ад назвы справы не мяняецца. Якжа абстаіць справа з падрыхтоўкай першага навучальнага году, які павінен пачацца 1-га кастрычніка?

Пачатак вучобы у інстытутах, якія адчыняюцца у Менску, знаходзяцца пад пагрозай зрыву. Вучэбныя памяшканьні, кватэры для выкладчыкаў і інтэрнаты для студэнтаў не падрыхтаваны.

З трох інстытутаў пакуль што маецца памяшканьне для будаўнічага інстытуту—гэта памяшканьне політэхнікуму. Для хэміка-тэхнолёгічнага адводзіцца памяшканьне раней займаемага БДУ (Земледзельчаскі зав.), але яно да гэтага часу не аслабаняецца апошнім. Для электра-тэхнічнага інстытуту памяшканьня зусім няма. Без памяшканьня, без папярэдняга абсталяваньня габінэтаў вучоба няможа пачацца.

Выкладчыкамі інстытуту ў гэтым годзе могуць быць задаволены. Маецца каля 100 заяў ад работнікаў БССР і РСФСР аб прыёме іх на навуковую працу ў Інстытуты. Але зразумела, што першая іх умова гэта забясьпечаньня жыльлёвай плошчай. Інакш і быць ня можа. Інстытуты кватэр ня маюць. Выхад трэба знайсьці але аб гэтым пакуль што ніхто ня думаў. Зараз у Менску будзе гатова каля 300 новых кватэр. БДУ і Інстытуты патрабуюць на першыя часы забраніраваць за імі 30 кватэр. Неабходна гэтае запатрабаваньне задаволіць.

Трэба пакончыць з бюрок[ратычн]ымі адпіскамі Наркомпрацы [і Нар]комасьветы, якія ня турбую[цца аб] сталай падрыхтоўцы пачатк[у наву]чальнага году. Некалькі раз запытваліся аб стаўках для [выкла]дчыкаў—па месяцу маўча[ць, а] адказваюць Што у такім [выпадку] сказаць выкладчыкам, якія па на навуковую працу і [...] віны ведаць умовы свайго [матэры]яльнага забясьпечаньня. [Трэба] даць інстытутам 5 інжынера[ў ...] самі згаджаюцца пайсьці на і прадпрыемствы ня суп[раціўляюцца] супроць іх уходу на на[вуковую] працу, але і ў гэтым выпад[ку Нар]компрацы маўчыць. Да яко[га часу] такія бюрократычныя адносі[ны Нар]компрацы і Наркомасьветы працягнуцца? Нічога ня [зроблена] НКА па падрыхтоўцы падр[ыхтоўчых курсаў,] асабліва па фізыцы і мат[эматыцы,] якія зусім адсутнічаюць [...]ку?

І апошняе самае балюч[ае пы]таньне:—трэба ў гэтым [навучаль]ным годзе разьмясьціць 5[..] [сту]дэнтаў. Да 1-га кастрычніка [ма]ецца памяшканьне на 300 [...] Інтэрнатаў няма. Парашыл[і будa]ваць баракі. Для інстытутаў [трэба] 13 баракоў. Будаўніцтва толькі зараз распачалося а[...] было пачакаць яшчэ трохі, [...] ецца з-за адсутнічаньня буд[аўнічых] матэр'ялаў.

Неабходна Наркомасьвет[е] паставіць пытаньне перад [...] там аб забраніраваньні пад [...] цкія інтэрнаты памяшканьн[яў ...] говых установаў, якія ў хутк[ім часе] будуць ліквідаваны, неабход[на] такі ажыцьцявіць думку а[б ...] зьменнай працы некаторы[х ...] поў і г. д.

Толькі крычаць, кадры, кадры... А на справе бюро[кратызм,] валакіта, безьдзейнасьць і [...]васьць замест выкананьня [дырэк]тыў партыі.

Соцыяльны склад паступаючых у БДУ пагоршыўся

Не дапусьціць прарыву ў падрыхтоўцы кадраў

Восеньні прыём у БДУ ў гэтым годзе вызначаецца наступнымі лічбамі:

На пэдфак—280 чалавек,
Мэдфак —200 „
Наргас —190 „
Савбуд — 80 „

УСЯГО 850 чалавек.

Але становішча з укамплектаваньнем гэтых факультэтаў ужо зараз падае трывожныя сігналы.

Сводка паступаючых у БДУ заяў на 20 ліпеня паказвае, што з агульнага ліку пададзеных 414 заяў ад рабочых і дзяцей рабочых паступіла толькі 72 заявы, ад батракоў 1 (?) заява, што разам складае каля 18 проц., у той час калі заявы ад служачых і інш. складаюць больш 50 пр.

Партыйная і комсамольская праслойка па асобным факультэтам зусім нязначная. Напрыклад, з 34 чалавек падаўшых заявы на мэдфак толькі два члены партыі, 2 кандыдаты і 18 комсамольцаў. На савбуд ад членаў партыі паступіла 3 заявы, і ад комсамольцаў—4.

Сводка падачы заяў за апошнюю пяцідзёўку не паказвае паляпшэньня якаснага складу паступаючых. За пяць дзён з 10 па 25 ліпеня падана 601 заява, з якіх ад рабочых і дзяцей рабочых—115, ад батракоў—3 і ад служачых і іншых—412.

На мэдфаку за 5 дзён паступіла 104 заявы ад служачых і інш., а ад рабочых толькі 36

Крыху лепшыя якасныя паказчыкі дае факультэт народнае гаспадаркі, дзе з 134 пададзеных заяў служачых 46 чалавек.

Надзвычайна мала пададзена заяў на ўсе факультэты ад колгасьнікаў. За апошнюю пяцідзёўку падана толькі 23 заявы.

Ужо зараз выразнай рысай вызначылася, што ў гэтым годзе наплыў у БДУ колькасна значна меншы чымся ў мінулагодні прыём і соцыяльны склад паступаючых горшы.

Зусім нездавальняюча комплектуецца факультэт савецкага будаўніцтва. Куды да 25 ліпеня падана ўсяго 60 заяў у ліку якіх толькі 15 заяў ад рабочых і дзяцей рабочых.

Пэдфак комплектуецца амаль выключна за лік настаўнікаў, ад якіх ужо паступіла 325 заяў. Ня гледзячы на рэзкі недахоп пэдагагічных кадраў і шэраг пастаноў партыі аб узмацненьні пролетарскага ядра на пэдагагічных факультэтах заявы ад рабочых паступаюць на пэдфак надзвычайна слаба. На апошні дзень падана ўсяго 23 заявы г. зн. 8 проц. да агульнага ліку пададзеных заяў на пэдфак. Трэба за адна-ж зусім выразна сказаць, што комплектаваньне пэдфаку за лік рабочых праходзіць зусім нездавальняюча. Курсы, якія былі організаваны профсаюзнымі організацыямі і Наркомасьветай па падрыхтоўцы рабочых у БДУ павінны былі даць асеньняму прыёму 1200 чалавек. Але з раз высьвятляецца, што гэтая лічба была дутая узятая з неправераных сьпісаў, жывых людзей няма, бо да 25-га ў БДУ перададзены сьпісы толькі на 50 чалавек.

Комсамольская організацыя пляцецца ў хвасьце. Яшчэ дагэтуль не мобілізавана належным чынам увага ўсей масы комсамольцаў на ўдарнае выкананьне задачы пастаўленай партыяй па падрыхтоўцы пэдагагічных кадраў. Да апошняга часу няма ніякіх вестак аб тым як ідзе мобілізацыя 1000 комсамольцаў у пэдагагічныя ВНУ. Лік комсамольцаў падаўшых заявы ў БДУ наогул і на пэдфак у асаблівасьці зусім нязначны.

Часу засталося мала. Комсамольская організацыя павінна безадкладна ўдарнымі тэмпамі правесьці вярбоўку комсамольцаў у пэдагагічныя ВНУ. Заданьне ЦК комсамолу павінна быць выканана з перавышэньнем.

Белдзяржбуд абяцае, а інтэрнаты ня будуюцца

Ня менш важнае месца ў падрыхтоўцы да навучальнага году займае пытаньне забясьпечаньня студэнтаў агульнажыцьцямі. Зараз не хапае агульнажыцьця на 1200 чалавек. Такім чынам памяшканьня няма ня толькі для новага прыёму, а нават студэнты старэйшых курсаў ня будуць забясьпечаны агульнажыцьцём.

Будаўніцтва бараку для студэнцкіх інтэрнатаў знаходзіцца на мёртвай кропцы. Месца будоўлі баракаў прадстаўляе сабою жудасны малюнак. Стаяць некалькі ўкопаных голых слупоў і больш нічога. Будаўнічых матэр'ялаў апрача некалькіх скрыначак цьвікоў няма.

Белдзяржбуд абяцаў да 1 верасьня адбудаваць 6 баракаў, але „абяцанкі цацанкі“, а баракі ня будуюцца і дзякуючы гэтаму плян пачатку навучальнага году ўжо, сарваны.

Меркавалася пачаць заняткі ў БДУ з 15 жніўня, але непадрыхтаванасьць да пачатку заняткаў прымус ла адцягнуць гэты тэрмін да 1 верасьня.

Кватэр для ўноў запрошаных профэсуры і выкладчыкаў няма і таму большасьць навуковых працаўнікоў не згаджаюцца ехаць на працу ў Менск.

Ні Наркамасьветы, ні праўленьне БДУ своечасова не паклапаціліся адбудаваць хаця-б адзін будынак выключна для кватэр навуковых працаўнікоў.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“
Н. Мінін.

3200 заяў у Менпалітэхнікум

З прадпрыемстваў заяў мала

„Прыём заяў у політэхнікум спынен“—такая абвестка вісіць пры уваходзе ў Менскі Дзяржаўны Політэхнікум.

На сёньняшні дзень у політэхнікум пададзена 3040 заяў. А разам з тымі заявамі, якія яшчэ прыбудуць з курсаў па падрыхтоўцы ў тэхнікумы і ВНУ лік іх дасягне—3200.

Папярэдняя норма прыёму вызначаная на 870 чалавек зараз па меркаваньнях Наркамасьветы зьніжаецца да 780, у гэты лік увойдзяць і 120 чал. прымаемых на дарожнае аддзяленьне па прапанове НКА шляхоў зносін.

Прыём робіцца на наступныя аддзяленьні: архітэктурнае—240, хімічнае—240, тарпяное—60, гідра-тэхнічнае—60 і дарожнае—120.

Вучот, які маецца на першыя 2000 пададзеных заяў паказвае наступны соцыяльны склад паступаючых: рабочых—128, дзяцей рабочых—562, батракоў—13, сялян-колгасьнікаў і саматужнікаў—337, з іх сялян аслабанёных ад сельска-гаспадарчага падатку—200, плоцячых падатак да 10 руб.—186 ад 10 р. да 20—82, ад 20 да 40 руб.—38, і звыш 40 руб.—8 асоб, выхаванцаў дзіцячых дамоў—29.

Гэтыя лічбы прыблізныя няпоўныя, але яны ўсё-ж паказваюць, што 75 проц. нормы прыёму першай катэгорыі, г. зн. рабочых і іх дзяцей і батракоў, якая зараз складае 703 заявы і яная будзе [...] поўнена 200 заявамі [з] кур[саў] курсаў па падрыхтоўцы ў [тэхнику]мы.—будзе забясьпечана.

Адная трэба адзначы[ць, што] колькасьць заяў пададзен[ых рабо]чымі непасрэдна працую[чымі на] вытворчасьці недастатков[ая].

„Лёгкая кавалерыя“ пол[ітэхніку]му распачала працу па вы[яўленьню] чужакоў, якія прыкрываю[чыся фаль]шывымі даведкамі імкнуцца ў тэхнікум.

На больш буйных заво[дах Мен]ску працуюць брыгады ст[удэнтаў] па вярбоўцы ў Політэхні[кум. Бры]гады ўжо разгарнулі сваю [працу] на заводах «Энэргія», «[...]» «Бальшавік» і на раба[...] жылсаюзу, Белдзяржбуду і [...] Гэтымі брыгадамі створа[ны на] прадпрыемствах гурткі па [падрых]тоўцы ў тэхнікум і створа[на ...] коў, якія працуюць непа[срэдна ў] тэхнікуме. Гурткамі ахоп[лена] 300 чалавек.

ЦЫРКУЛЯРАМІ ЖЫВЁЛУ НЕ НАКОРМІШ

Бюрократызм, цыркулярныя адпіскі—губяць жывую справу сілосаваньня

Сілосны тыдзень павінен зьявіцца рашучай атакай комсамолу за выкананьне пляваў сілосаваньня

Ударны тыдзень

Яшчэ ў маі месяцы мы пісалі аб тым, што справа сілосаваньня у БССР знаходзіцца пад поўнай пагрозай зрыву.

— Наркомзем БССР—пісала наша газэта—замест баявой мобілізацыі сваіх сіл, ... на выкананьне плянаў пайшоў на лініі найменьшага супраціўленьня і скараціў пляны сілосаваньня з 2-х мільёнаў тон (вызначаных НКЗ СССР) да 1-га мільёну.

Акруговыя і раённыя організацыі ў сваю чаргу таксама скарачалі заданьні Наркомзему БССР і ў выніку такіх скарачэньняў, плянавае заданьне па сілоснаму будаўніцтву і сілосаваньня кармоў на сёньнешні дзень фактычна сарвана. Па БССР павінна быць засілосавана 1.000.000 тон зялёнага корму, з якіх 125 тысяч тон павінны засілосаваць саўгасы, 450 тысяч колгасы, 400 тысяч паселішчы і астатнія 25 тысяч тон іншыя організацыі.

Каб засілосаваць гэтую колькасьць патрэбна выкапаць каля 2-х з паловай мільёнаў кубамэтраў ямаў.

Ужо павінна было-б быць пабудавана ня меньш 50 проц. усіх ям, траншэй і сілосных баштаў і засілосавана ня меньш 25-30 проц. кармоў.

Які-ж малюнак маем на сёньнешні дзень!—Усяго выкапаў колгасах 8973 кубамэтраў, а ў паселішчах толькі 72 кубамэтры. Саўгасы амаль што зусім ня прыступілі да сілоснага будаўніцтва. Такім чынам процант выкананьня сілоснага будаўніцтва па БССР складае 0,4

Комсамол Савецкага Саюзу ўзяў на сябе абавязак выкапаць 1 мільён сілосных ям і траншэй. Выходзячы з гэтага ЦК ЛКСМБ вынес пастанову:

Пабудаваць сіламі кожнай комсамольскай ячэйкі ня менш **30 ям.**

Як выконваецца гэтае заданьне наша газэта не адзін раз пісала і разам з гэтым **сігналізавала аб тых напляваўцельскіх праваопортуністычных адносінах акруговых і раённых камітэтаў комсамолу да гэтай справы**, але камітэты да гэтага часу бязьдзейнічаюць і нічога ня робяць у гэтым напрамку.

Толькі гэтымі днямі бюро Менскага Акругкому ЛКСМБ слухала справаздачы двух райкомаў—Сьмілавіцкага і Самахвалацкага. І што выявілася?

Кіраўніцтва, як Сьмілавіцкага, так і Самахвалавіцкага камітэту комсамолу ня ведаюць колькі трэба будаваць у раёне сілосных ям і на-колькі тон.

Па Самахвалаўскаму раёну выкапана ўсяго **3 ямы** і то не сіламі комсамолу. У Сьмілавіцкім раёне выкапана па ініцыятыве комсамольцаў—12 ям.

Такое становішча і па астатніх раёнах акругі і астатнім акругам БССР.

Пра-одзімы дзесяцідзеньнік па сілосаваньню павінен зьявіцца рашаючым па выкананьню тых абавязкаў, якія комсамол Савецкага Саюзу і ў тым ліку БССР узяў на сябе перад партыяй і ўрадам.

За кожную нявыкапаную яму, за кожную не засілясаваную тону павінны несьці адказнасьць комсамольскія ячэйкі, раённыя і акруговыя камітэты, інакш нельга ставіць пытаньне.

· Заставіўшыяся 8 дзён павінны ператварыцца ва Усебеларускі суботнік комсамолу па будаўніцтву сілосных ям і траншэй, а таксама запаўненьня іх сілоснай масай.

Жыткавіцкія бюрократы задушылі ініцыятыву комсамолу

Прайшоў месяц з таго часу, як Жыткавіцкі райком КСМ прапрацоўваючы пытаньне аб сілосным будаўніцтве вызначаў пабудаваць сіламі комсамольскае організацыі 500 сілосных ям.

Шмат каго з адказных працаўнікоў у раёне гэта пастанова спалохала. Пашлі размовы: **„ня выканаем, па пляну, мяркуецца толькі 18“. „Вам цяжка ўзяцца, а кінуць... заўсёды—майстры“.**

Ня гледзячы ні на што комсамольская організацыя, за сілоснае будаўніцтва ўзялася з усёй настойлівасьцю і сур'ёзнасьцю. Пачын комсамольцаў, ніхто ў раёне **не падтрымаў. Бюрократычныя адносіны, коснасьць раённых працаўнікоў задушылі ініцыятыву.**

Прывядзем некалькі абураючых фактаў:

Гора—кіраўнікі сарвалі суботнік

Комсамольская організацыя, каб скласьці грамадзкую думку вакол неабходнасьці сілоснага будаўніцтва і на справе дабіцца, ва ўмовах раёну вырашэньня кармавой проблемы, парашыла ў падарунак XIV зьезду УсеКП(б) **організаваць масавы комсамольскі суботнік па сілоснаму будаўніцтву.**

На словах, гэта мерапрыемства, усе спаткалі добра. Нават чуліся пахвалы: „малайцы» вось гэта „талкова“ але на справе атрымалася іншае—сарвалі.

Калі трэба было Райкому паслаць прадстаўнікоў у ячэйкі для праводжаньня падрыхтоўчай работы да суботніку і аказаньня на месцах практычнай дапамогі, дык з 6-ці аграномаў (занятых на працы ў раёне), **знайшоўся толькі адзін, які паехаў у вёску.**

РК пастанавіў у адну з ячэек накіраваць комсамольца, працаўніка Райколгассаюзу, у адказ Старшыня Райколгассаюзу тав. **Фінкельштэйн** сьвядома, каб сарваць пастанову РК КСМ напісаў загад (па якому яму патрэбна было ехаць зусім у другое месца):

— „Тав. Васіленка. Тэрмінова выехаць у Пухавіцкі с-с, для налажджаньня малочнай арцелі і праводжаньня поўнай і канчатковае контрактацыі на ўсіх с-с. У выпадку, калі акажацца, што контрактацыя ня будзе поўнасьцю праведзена—нясеце адказнасьць“.

„Чуў... напішыце самі... падпішу..“

Больш таго, калі РК КСМ зьвярнуўся да часова выконваючага абавязкі сакратара РК КП(б)Б, **т. Фэльдмана** з просьбаю даць дырэктыву партыйным ячэйкам аб садзейнічаньні комсамольскім ячэйкам у правядзеньні суботнікаў, дык таксама быў атрыман адказ: „Сілоснае будаўніцтва?—так ёсьць такая справа... Чуў... Напісаць... Ну так напішыце там самі в установкі ЦК, я падпішу“.

Бачыце, ён „чуў“... „напішыце самі“.

„Сакратар Ветчынскай ячэйкі КП(б)Беларусі—таварыш **Чаур,** на комсамольскім сходзе выступіў супроць закладкі вопытных ям, мотывіруючы тым, што зараз няма часу займацца сілосамі,

Нават старшыня РВК—**Рашал,** запрошаны на параду мястэчковага комсамольскага активу, на пытаньню сілоснага будаўніцтва, змог „достоить“ комсамольцаў толькі сваім запытаньнем:—„А ці хопіць цэмэнту для пабудовы такой колькасьці сілосных ям? Цікава адкуль яму ведаць, што сілосныя ямы магчыма будаваць з цэмэнту(?!)

Пасьля ўсяго гэтага зусім не дзіўна, што заданьне па пасеву сілосных культур засталося далёка невыкананым.

З патрэбных рассеяць 1700 кгр. кукурузы, засеяна толькі 361 кгр., на плошчы 8,6 га з іх колгасамі засеяна 4,6 га. С сланечнікамі засеяна на 3,5 га (колькі было заданьне па засеву сланечнікаў ніхто ня ведае), і нарэшце зусім бясчынным зьяўляецца той факт, **што плян па сілоснаму будаўніцтву ня толькі не даведзен да колгасаў, а яшчэ канчаткова не прапрацованы ў Райколгассаюзе** Райзем—часта сьпіць.

Так пахавалі жыткавіцкія бюрократы ініцыятыву комсамольскай організацыі.

А. С.

Дарог на сьвеце многа,
Людзей таксама шмат.
Прыйшлі за дапамогай,
Ды атрымалі... зад.

І вось шукай тут выйсьця,
Кліны—куды ня кінь.
Іх трэба грэць і чысьціць,
Кіраўнікоў такіх! **Ві—лін.**

Прыступіць да масавай закладкі сілосных установак

(Усім абкомам, крайкомам, ЦК КСМ нац рэспублік)

Згодна рашэньня бюро ЦК УсеЛКСМ з 25-га ліпеня па 5-ае жніўня 1930 г праводзіцца ўсесаюзны сілосны тыдзень. Асноўнай задачай тыдню зьяўляецца мобілізацыя максімуму сіл комсамольскай організацыі і ўсёй савецкай грамадзкасьці на фактычнае вырашэньне проблемы жывёлагадоўлі, у прыватнасьці, на організацыю пачатку масавага сілосаваньня, меўшага вялікае значэньне ў вырашэньні кармоў, усёй кармавой проблемы.

Сілосны тыдзень павінен зьявіцца пачаткам масавай закладкі сілосных установак, расьліннай масай і праводзіцца сапраўды баявымі тэмпамі.

У часе тыдню павінна быць арганізавана праверка выкананьня на месцах заданьняў партыі, ураду і абавязацельстваў комсамолу па сілосаваньню і шырока разгорнута практычная работа па сілоснаму будаўніцтву. Усім комсамольскім організацыям неабходна неадкладна пачаць шырокую падрыхтоўку да усесаюзнага тыдню, зрабіць галоўны ўпор ў працэсе правядзеньня на праверку сапраўднай падрыхтаванасьці комсамольскіх організацый да выкананьня ўзятых на сябе абавязацельстваў, на праверку прыгоднасьці выкапаных ям і траншэй сілосаваньня, на забясьпечаньне загрузкай сыравінай і г. д. Для забясьпечаньня пасьпяховага правядзеньня тыдню організацыям саюзу неабходна:

1 Ва ўсіх камітэтах і вясковых ячэйках абгаварыць пытаньне аб усесаюзным сілосным тыдні і распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы па яго праводзеньня, улічваючы мясцовыя ўмовы.

2. Ва ўсіх абласьцях, акругах і раёнах правесьці мобілізацыю комсамольцаў для пасылкі ў сёлы (на 10—20 дзён) з мэтай аказаньня практычнай дапамогі вясковым ячэйкам у праводзеньні тыдню організацыі масавай прапаганды і інструктажу па сілосаваньню на месцы, акрамя таго, выкарыстаць друк, даклады, гутаркі агрономаў і інш.

3. Разгарнуць максымальным тэмпам падрыхтоўку да масавага сілосаваньня (абучэньне сілоснай справе, падрыхтоўка машын, расьліннай масы інструктаваньня і г. д.) паўсямесна форсіруючы будаўніцтва сілосных установак, пачаць закладку ў іх расьліннай масы.

4. Організаваць у час тыдню агляд гатоўнасьці да сілосаваньня ўсіх установак і організацый, у сёлах і колгасах організуючы гэта на прыкладу агляду гатоўнасьці да севу. У адносінах да бязьдзейнічаючых і тармазячых практычнае правядзеньне сілосаваньня прыняць самыя рашучыя меры, як да зрываючых абавязацельства саюзу і рашэньне партыі.

5 У час тыдня організаваць шырокі ўдзел у практычнай рабоце па сілосаваньню гарадзкіх комсамольскіх ячэек, праз правядзеньне імі ў сяле спэцыяльных суботнікаў па сілоснаму будаўніцтву, пасылку брыгад і г. д.

ЦК падкрэсьлівае, што мяючыяся зараз тэмпы работ комсамолу па рэалізацыі рашэньня ЦК аб мільёне сілосных ям і траншэй сіламі комсамолу зусім недастатковыя і абавязвае ўсе організацыі у час сілоснага тыдню такое становішча ліквідаваць, забясьпечыўшы сапраўднае выкананьне рашэньня ЦК, а тым самым значна забясьпечыць савецкую жывёлагадоўлю кармавой базай.

Усім абкомам крайкомам і ЦК нац. рэспублік не пазьней 25-га ліпеня прыслаць першыя справаздачы з конкрэтнымі паказальнікамі і лічбамі аб усёй рабоце, праведзенай па сілосу організацыямі комсамолу і мясцовымі савецка-кооперацыйнымі організацыямі.

Другую інформацыю выслаць да сканчэньня сілоснага тыдню і систэматычна інформіраваць аб ходзе работы аж да сканчэньня ўсёй кампаніі.

Заг. с-т сэктарам
ЦК УсеЛКСМ **ПАНЦЮХ-Ў.**

Заданьне павінна быць выканана

Вакол сілоснага корму ў Барысаўскім раёне ня мобілізавана грамадзкая думка колгасьнікаў, комсамольскіх ячэек і бядняцка-серадняцкіх мас.

Так, напрыклад, курсы па сілосаваньню, якія праходзілі ў раёне камплектаваліся без усякай падрыхтоўчай работы роўна... у тры дні. І таму мы маем такое становішча, што замест 60 чалавек на курсы прыехала **усяго 20.**

Многія колгасы зусім ня ведалі аб існаваньні курсаў па падрыхтоўцы работнікаў сілоснага будаўніцтва. **Комсамол таксама нічога ня** ведаў і толькі **ў канцы ўсёй работы курсаў райком даведаўся аб іх існаваньні.**

У некаторых працаўнікоў раёну пануюць шкодныя думкі аб тым, што наўрад ці выканаем 50 проц. заданьня. Такія разважаньні ня вядуць прывесьці ні да чаго, акрамя зрыву працы.

Заданьне 3000 тон патрэбна выканаць у чым-бы то ня было. Для гэтага маюцца магчымасьці, для гэтага ёсьць сродкі.

Заданьне **можна і патрэбна перавыканаць пры той умове,** калі будзе праведзена шырокая работа сярод бядняцкай часткі вёскі аб сумесным на таварыскіх пачатках сілосаваньні.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“
М. АДЗІНЕЦ.

Правесьці ўдала і другі тур

Комсамольскі колектыў колгасу **„Бальшавік Беларусі“** (Клімаўшчына) пасьля абвешчанага 10-дзённіка па засеву сілоснымі культурамі пустуючых зямель горача адгукнуўся на гэтую прапанову. Былі складзены ўдарныя комсамольскія брыгады, якія засеялі 10 **гэктараў кукурузы, якая пойдзе для сілосу.**

Юнкораўская брыгада „Ч. З.“ колгасу „Бальшавік Беларусі“.

„Што гэта за сілос?..“

Комсамольская організацыя Рачыцкага раёну на чале з райкомам комсамолу нічога **ня робяць па сілосаваньню.** На запытаньне ў сакратара РБ, што конкрэтна робіцца па сілосаваньню, апошні адказаў:—„Абгаварылі на пленуме, разаслалі пляны і... усё“.

Больш нічога практычнага райком не зрабіў. На раёну трэба засілосаваць 5.000 тон у колгасах і 6.000 тон па індывідуальнаму сэктару. Але на сёньняшні дзень **ні адна тона не засілясавана.** Райколгассаюз і райможывёлсаюз бюрократычна адносіцца да гэтай справы. Вытворчыя комсамольскія ячэйкі ў гэтым напрамку таксама нічога ня робяць.

Райком партыі партыйным ячэйкам ніякіх паказаньняў адносна сілосаваньня ня даў, а сакратар РК партыі са зьдзіўленьнем пытае:—«Што гэта за сілос». Такія адносіны раённых організацый да сілосаваньня фактычна зрываюць гэтую справу.

Брыгадзір „Ч. З.“ **М. Рэчыцкі.**

...арнаў супроць сілосу

Комсамольская ячэйка колгасу „Пабеда“ Вульскага раёну ніякай работы па сілосаваньню не праводзіць. Сакратар комсамольскай ячэйкі тав. Баранаў адмаўляецца ад гэтай работы. Праўда, ячэйка намеціла па пляну правядзеньне сходаў сярод сялян, але пляны засталіся на паперы.

Комсамолец.

Прагульшчык, рвач, ілжэўдарнік—нашы ворагі

Промфінплян павінен быць і будзе выкананы.—Патрэбна па-бальшавіцку працаваць у рабочых масах.—Даць варштату промфінплян.

Рашуча біць па рвачох, ілжэўдарніках і прагульшчыках

Прагульшчыкі і гультаі пад крылом адміністрацыі

Шмат ужо пісалася ў друку і ў прыватнасьці ў „Чырвонай Зьмене" аб недавыкананьні промфінпляну на фабрыцы „Пролетарская Перамога" (Н.-Барысаў), але гэтыя сігналы друку аб прарывах у недавыкананьні промфінпляну не зьявіліся для партыйнага комсамольскага і гаспадарчага кіраўніцтва фактарам неабходнай мобілізацыі рабочых мас на барацьбу за выкананьне промфінпляну.

Яны не прымалі мер да організацыі рабочых мас на зьнішчэньне перашкод, зрываючых пасьпяховую працу па выкананьню промфінпляну.

Вось факты зрываючыя працу фабрыкі па выкананьню пляναў з якімі не вядзецца належнай барацьбы, аб іх гаварылі самі рабочыя на цэхавых сходах.

На фабрыцы вялікая колькасьць упоў прынятых рабочых, якія зьяўляюцца выхадцамі з кустарных прадпрыемцаў і сельскай гаспадаркі. Яны зусім не зацікаўлены ў падняцьці вытворчасьці працы. Маецца шэраг фактаў, калі работніцы адмаўляюцца ад працы на двух варштатах у той час калі гэта магчыма і неабходна. Напрыклад, работнікі здымальнага цэху не хочуць працаваць на двух варштатах, а жыцьцё паказала, што нават магчыма працаваць на чатырох.

Другі факт,—гэта выкарыстаньне выхадных дзён у сувязі з пераходам фабрыкі на бесьперапынку, стварыла такое становішча, што асобныя рабочыя бяруць выхадныя дні па свайму жаданьню, ад чаго бывае, што ў адзін дзень усе рабочыя зьяўляюцца на працу, а другія дні не зьяўляецца вялікая колькасьць і адміністрацыі прыходзіцца зьбіраць па кватэрам на працу. Маецца на ф-кі шэраг прагульшчыкаў і гультаёў і адміністрацыя не прымае ніякіх захадаў супроць прагулаў, гультайства, што выкарыстоўваюць адсталыя колы упоў уліўшыхся рабочых разважаючы: „Усё роўна не звольняць з працы, бо не хапае рабочых рук".

Нельга прайсьці і міма безадказнай працы разьліковага стола ф-кі, дзякуючы галавацкству якога за чэрвень месяц было не занесена ў ведамасьць выплаты пэнсіі 200 чал., што выклікала абурэньне сярод рабочых.

Аб усіх гэтых ганебных фактах на цэхавых сходах старыя рабочыя балюча гаварылі, прапануючы прыняць самыя рашучыя захады над тымі, хто зрывае працоўную дысцыпліну і выкананьне промфінпляну, а таксама і да адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу, які не прымае захадаў да аздараўленьня працы на фабрыцы.

Цікава запытацца, што-ж рабіў комсамольскі колектыў для таго, каб зьнішчыць гэтыя факты і што зроблена колектывам у справе організацыі вытворча-выхаваўчай працы сярод моладзі толькі што прышоўшай на прадпрыемства з саматужнай прамысловасьці і вёскі. Трэба адказаць адно—**што з боку комсамольскага колектыву не прынята ніякіх захадаў, комсамольскія ячэйкі бязьдзейнічаюць, а колектыў не кірує іх працай**, комсамольцы не праводзяць ніякай працы па ўцягваньню моладзі ва ўдарныя брыгады і соцыялістычнае спаборніцтва.

Зараз—на фабрыку прыехала для праверкі становішча працы брыгада ВСНГБ, патрэбна, каб усе рабочыя і ў першую чаргу партыйна-комсамольскія ячэйкі дапамаглі гэтай камісіі выкрыць усе хваробныя зьявішчы, перашкаджаючыя ў працы фабрыцы з тым, каб вакол гэтых фактаў мобілізаваць увагу рабочых.

С. Федаровіч.

Мобілізуючы энтузіязм рабочых мас—ліквідуюць прарывы

Шчотачную фабрыку ўзяць на „грамадзкі буксір".

На шэрагу прадпрыемстваў Віцебску, дзякуючы разгортваньню шырокай масавай працы сярод рабочых і даведзеньня промфінпляну да варштату і паасобнага рабочага, зроблен пералом у выкананьні промфінпляну.

Так, напрыклад, на ф-цы «Дзьвіна» калі ў маі месяцы промфінплян быў выканан толькі на 96 проц., дык пасьля таго, як вакол недавыкананьня промфінпляну партыйнай організацыяй была праведзена праца, быў даведзен промфінплян да кожнага варштату і па ўсіх цэхах і аддзяленьнях вывешаны дошкі з кантрольнымі лічбамі. I-ая дэкада чэрвеня месяца дала выкананьне промфінпляну на 102,15 проц., а другая дэкада чэрвеня—101,6 проц.

На заводзе Медпром I промфінплян выканан на 104 проц., завод з посьпехам працуе над выкананьнем заказаў абутковая фабрыка „Лекерта" і Хлебазаводу аб зрыве выкананьня якіх у свой час пісала газета „Віцебскі Пролетары". На заводзе організаваныя 12 ударных брыгад, якія даюць добрыя вузоры працы.

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал за апошнія часы лепш адносіцца да прапаноў рабочых, у выніку з унесеных 40 прапаноў па палепшаньню працы на вытворчасьці, 30 ужо прынята для ажыцьцяўленьня.

Побач з гэтым патрэбна адзначыць, што маецца асобныя прадпрыемствы, якія яшчэ і да апошняга часу не прынялі ніякіх захадаў да зьнішчаньня маючыхся прарываў недавыкананьня промфінпляну, дзе не праведзена ніякай масавай працы сярод рабочых, такім прыкладам можа зьявіцца шчотачная фабрыка. Вось факты:

Промфінплян не быў своечасова даведзен да цэхоў і варштатаў, не вывешана кантрольных лічбаў па цэхох, рабочыя не ведалі паказчыкаў выкананьня промфінпляну. У выніку промфінплян па фабрыцы недавыканан. Не выканана заданьне і па зьніжэньню сабекошту ў гэтае паўгодзьдзе ў той час, як за першае паўгодзьдзе на фабрыцы было павышэньне сабекошту на 2,37 проц.

Сярод асобных груп рабочых фабрыкі ў тым ліку асобных ударнікаў пагладаюцца рвацкія адносіны да вытворчасьці. Маецца шмат ілжэ-ўдарнікаў з якімі ні адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал, ні партыйныя, комсамольскія організацыі не вядуць барацьбы, не праводзіцца належнай політыка-выхаваўчай працы сярод ударных брыгад і рабочых. Нават пытаньне аб адзінаначальлі не прапрацоўвалася сярод рабочых фабрыкі.

Патрэбна шчотачную фабрыку ўзяць на „грамадзкі буксір".

К.

Даёш сілосарэзні!

У сувязі з вялізарным будаўніцтвам сілосаў ад заводаў патрабуецца выпуск вялікай колькасьці сілосарэзак. Вялікія па тыі сілосарэзак выпускае завод сельска-гаспадарчага будаўніцтва ў Гомелі.

На здымку: сілосарэзкі гатовыя да адпраўкі.

ШАХМАТЫ І ШАШКІ

Менскія шахматна-шашачныя спаборніцтвы

Шахматна-шашачная камісія ЦСПСБ організуе шахматна-шашачныя спаборніцтва профсаюзаў. Спаборніцтва будзе праходзіць па групах, размеркаваных згодна моцнасьці гульні. Усе ўдзельнікі турніра будуць валіфікаваны. Лепшым іграком будуць выдадзены прызы. Усе шахматысты і шашысты жадаючыя прыняць удзел павінны запісацца ў Культ. Сэктары ЦСПСБ (Дом працы, II-гі паверх, тэл. 4-71) у тая. Маззяя 28-га, 30-га ліпеня і 3 жніўня ад 11 да 2-х гадз. дню і ад 6-ці за 8-мі гадз. увечары. Запіс праводзіцца таксама ў шахматна-шашачнай б зе саду „Профінтэрн" да 3 жніўня ўключна. Спаборніцтва пачнуцца 5-га жніўня.

Пленум Усесаюзнага шахматна-шашачнага Сэктару

У Маскве адбыўся І-ы Пленум Усесаюзнага Шахматна-Шашачнага сэктару ВСФК пры ЦВК СССР. Пленум зацьвердзіў Шахматную Пяцігодку. Згодна гэтай пяцігодкі ў 1932—33-м годзе ў Шахматна-шашачнай працай павінны быць ахоплены 4 мільёна чалавек, галоўным чынам рабочых і калгасьнікаў.

Пленум адзначыў, што шахматна-шашачная праца яшчэ недастаткова ўвязана з агульна-палітычным жыцьцём, што шахматна-шашачныя гурткі яшчэ цалкам не павярнуліся „тварам да вытворчасьці".

Адзначана што шэраг Рэспублік і акруг яшчэ да гэтага часу не рэорганізавалі структуру шахматна-шашачных органаў: працуюць замест сэктароў пры Саветах Фізкультуры-сэкцыі.

Трэба адзначыць, што і ВСФКБ не рабудоўвае структуру ш.-ш. органаў са спазьненьнем.

На пленуме прысутнічалі ад Беларусі т. т. Мазаль і Нікіцін.

Усесаюзны матч—турнір

У Кастрычніку г. г. у Маскве адбудзецца Шахматны Матч—турнір лепшых гульцоў СССР. Прымуць удзел Гроссмейстер—Верлінскі—Масква, Багатырчук—Кіеў, малады шахматыстчэмпіён Ленінграда—Батвінік і пераможнік турніру майстроў г. Масквы, які яшчэ не скончыўся.

У верасьні ў Тыфлісе адбудзецца турнір майстроў БССР УССР і ЗСФСР. Пераможнік гэтага турніру таксама прыме ўдзел ва Усесаюзным матч-турніру.

Міжрэспубліканскі турнір па перапісцы

У Міжрэспубліканскім турніру па перапісцы, які зараз адбываецца паміж БССР УССР і РСФСР скончылася першая партыя. Малады Менскі шашысты т. Касьперскі В. выйграў у Маскоўскага шашыстага—Плоткіна. Партыя гулялася ўсяго 2 месяцы. Гэта адна з самых кароцейшых (па гуляваму часу) партый, якія калі-небудзь гуляліся па перапісцы.

Рэалізацыю пазыкі на рэйкі соцспаборніцтва

Пасьпяхова праходзіць падпіска на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады" па шэрагу заводаў і фабрык Беларусі

На Гомельскім машына-будаўнічым заводзе „Пролетарый" з 1026 рабочых ужо на 24 ліпеня было ахоплена падпіскай 662 чалавекі, на суму каля 55 тысяч рублёў.

Рабочыя падпісваюцца на 80-85 проц. свайго месячнага заработку. Цэхі уступаюць у соцспаборніцтва, на лепшае правядзеньне падпіскі.

Не адстае і Гомельскі сельмаш. На Гомсельмашы падрыхтоўчая праца па рэалізацыі пазыкі пачалася з 1 ліпеня, на апошні час маецца больш 12 тысяч рублёў падпіскі на пазыку.

На заводзе „Рухавік Рэволюцыі" ахоплена падпіскай больш 50 пр. рабочых, агульная сума на апошні час складаецца ў 8500 рублёў, ва ўсіх цэхах створаны ініцыятыўныя групы для рэалізацыі пазыкі.

Рабочыя „Полесдруку" падпісаліся на 6000 рублёў, у той-жа час як зарплата ўсіх рабочых за два тыдні складае—5000 рублёў.

Менскія заводы і фабрыкі не адстаюць ад Гомельскіх.

75 проц. рабочых заводу „Чырвоная Зорка" ахоплены падпіскай на пазыку. Сабрана падпіскі больш 3500 рублёў.

Рабочыя заводу «Беларусь» мелі на 23 ліпеня 4420 рублёў.

Рабочыя фабрыкі „Комунарка" не адстаюць ад іншых заводаў і фабрык, падпісаліся на 75 проц., 100 проц. і больш процантаў месячнага заработку, перавысіў лёзунг „двухтыднёвы заработак у пазыку дзяржаве". Уперадзе па падпісцы ідуць ударныя брыгады і комуны.

У Віцебску, Барысаве, Бабруйску, Воршы і іншых гарадох Беларусі, і ў некаторых вясковых раёнах шырока разгарнулася падпіска на пазыку „Пяцігодка, у чатыры гады".

Гэтыя факты яскрава сьведчаць аб тым, што пазыка пасьпяхова рэалізуецца працоўнымі масамі. Але гэта актыўнасьць, гэты энтузіязм і інтарэс мас зачастую натыкаюцца на невялікую вялаcьць і нерухомасьць у працы грамадзкіх організацый. Аб гэтым яскрава гаворыць таварыская сустрэча рабкораў і ўдарнікаў Гомельшчыны з прадстаўнікамі Акруговых, партыйна-савецкіх і фінансавых устаноў, організаваная Гомельскай акруговай газэтай „Палеская Праўда".

На таварыскую гутарку—сустрэчу, дзе прысутнічала 40 рабкораў і ўдарнікаў сумесна з прадстаўнікамі, акруговых, партыйна-савецкіх і фінансавых устаноў высьветлілася, што падпіска застала шэраг організацый фабрык і заводаў у [illegible] палох.

Вось факты: на завод Лапу[illegible] га толькі 21 ліпеня(!) былі [illegible] дзены гутаркі па цэхах аб па[illegible] Камісіі садзейнічаньня, на [illegible] прадпрыемстваў і установах [illegible] дзейнічаюць. Партячэйкі і фа[illegible] комы не разгарнулі, належна[illegible] стлумачальнай падрыхтоўчай пр[illegible] Асобныя партыйцы з-за др[illegible] падрыхтоўчай працы плятуц[illegible] хвасьце надстрояў адсталых [illegible] чых, шэраг комуністаў і комса[illegible] цаў адмаўляюцца ад падпіск[illegible] бочы заводу „Пролетары", чл[illegible] комсамолу т. Жылін катэгар[illegible] адмовіўся ад падпіскі на паз[illegible] іншыя комсамольцы як, напры[illegible] Шчаціхін („Пролетары") плят[illegible] ў хвасьце.

На заводзе „Рухавік Рэвол[illegible] партыец Зальцер на прапанову [illegible] пісацца на пазыку, адказаў:—[illegible] станьце! Я не ведаю на як[illegible] сьвеце жыву, я трацію пазык[illegible] чу прадаць, а вы суецеся з не[illegible]

Гэта таварыская гутарка-су[illegible] ча яскрава паказала як нека[illegible] організацыі замест правяд[illegible] шырокай растлумачальнай [illegible] здаюцца на самацёк—зрываю[illegible] тым пасьпяховае правядзеньне[illegible] цы па рэалізацыі пазыкі.

Мы павінны дабіцца, каб у[illegible] організацыяй растлумачальна[illegible] цы ахапіць падпіскай 100 [illegible] рабочых, служачых і прац[illegible] сялян.

Комсамольскія організацыі [illegible] гэтай справе павінны быць [illegible] радзе.

Ц.

Прыём у БелТРА[illegible]

28-га ліпеня, а 7-ай гадзі[illegible] чары ў памяшканьні Дома [illegible] мелу скліканаецца сход усіх [illegible] чых паступіць у Беларускі [illegible] Рабочай Моладзі.

Выканбюро ТРА[illegible]

У панядзелак, 28 ліпеня г. [illegible] з 6 гадз. увечары ў пам[illegible] каньні ФРК а будзецц[illegible]

ПАСЕДЖАНЬНЕ КАН[illegible] ФЛІКТНАЙ КАМІСІ[illegible]

ФРК ЛКСМБ

Выклікаюцца ўсе тавары[illegible] маючыя канфліктныя спр[illegible] Яўка сяброў КК—абавяз[illegible]

ФРК ЛКСМ[illegible]

Сёньня 27-VII, а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца дэманстр[illegible] цыя піонерорганізацыі гор. Менску прысьвечаная зачыненьн[illegible] зьлёту.

Збор атрадаў на райкамоле ЛКСМБ пад адказнасьць па[illegible] дыроў.

Цэн. АБДКА.

Прыём у Фізкультурны тэхнікум

З 1-га жніўня па 5-е верасьня г. г. адчыняецца прыём ад асоб жадаючых паступіць у Менскі Дзяржаўны тэхнікум фіз[illegible]туры.

Тэрмін навучаньня 3-хгадовы.

Жадаючыя паступіць павінны прадставіць усе дакуманты давесніка НКАБ.

Акрамя таго паступаючыя праходзяць медагляд пры ўрач[illegible] габінэтах, здаюць іспыты па фізычнай падрыхтоўцы, атрымоў[illegible] анкеты і ўсе даведкі ў Акрсаветах фізкультуры.

Усе заявы накіроўваць па адрасу: **Менск, Абонемэнт. па[illegible]вая скрынка № 65.**

АДМІНІСТРАЦЫ[illegible]

Адказны рэдактар—Рэдколег[illegible]

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599